2 Бемер, Генрих. История ордена иезуитов / Г. Бемер. – Смоленск: Русич, 2002. – 464 с.
3. Булгаков, С.Н. Христианство и социализм / С.Н. Булгаков. – Новосибирск: Наука, 1991. – 386 с.
4. Григулевич, И.Р. Крест и меч. Католическая церковь в испанской Америке, XVI-XVIII вв. / И.Р. Григулевич. – М.: Наука, 1998. – 295 с.
5. Лафарг, Поль. Иезуитские республики / П. Лафарг. - СПб.: Русский путь, 1904. – 81 с.
6. Сомин, Н.В. Государство иезуитов в Парагвае / Н.В. Сомин. – М.: «Ковчег», 2006. – 278 с.
7. Сомин, Н.В. Экономические категории в священном писании и церковном учении / Н.В. Сомин. – М.: «Ковчег», 2003. – 236 с.
8. Светловский, В.В. Коммунистическое государство иезуитов в Парагвае в XVII и XVIII стст. / В.В. Светловский – Петроград, Путь к знанию, 1924. – 85 с.
9. Фийор, Ян Утопия или земной рай? Первое в мире комму-нистическое общество / Я. Фийор. // Истина и жизнь. – 2001. – № 4. – С. 32-39.
10. Шафаревич, И. Р. Социализм как явление мировой истории: в 3-х томах / И.Р.Шафаревич. – Т. 2. М.: Наука, 1994. – 427 с.
11. Энциклопедия “Вокруг света” – Дата доступа:12. 10. 2012.

## НАЦЫЯНАЛЬНА-ДЗЯРЖАЎНАЕ ПЫТАННЕ У ПРАГРАМНЫХ ДАКУМЕНТАХ БЕЛАРУСКАЙ ХРЫСЦІЯНСКАЙ ДЭМАКРАТЫІ (1917–1939 гг.)

Багдановіч А.Г., кандыдат гістарычных навук, дацэнт

Беларускі хрысціянска-дэмакратычны рух, што зарадзіўся на пачатку XX ст., знайшоў свой лагічны працяг у заснаванні так званай Хрысціянскай Дэмакратычнай Злучнасці беларусаў – клерыкальнай нацыянальнай партыі, што ўзнікла ў маі 1917 г. у Петраградзе. Галоўнымі ідэолагамі партыі былі беларускія ксяндзы Ф. Абрантовіч, Л. Хвецка, А. Станкевіч, В. Гадлеўскі, Ф. Будзька,

А. Зязюля (А.С. Астрамовіч), К. Сваяк (К. Стаповіч) і інш. Друкаваным органам руха была газета “Беларуская крыніца”*.

ХДЗБ аб’ядноўвала спачатку толькі нязначныя па колькасці гурткі беларускай інтэлігенцыі з настаўніцтва, слухачоў духоўнай акадэміі з Петраграда і святароў Мінска. Потым сацыяльная база арганізацыі значна пашырылася за кошт сялян-католікаў. На канец 1917 г. партыя налічвала больш за 300 чалавек [2, с. 113].

24-25 мая 1917 г. Злучнасць арганізавала ў Мінску з’езд беларускага каталіцкага духавенства, у якім удзельнічалі дэлегаты з Мінску, Магілёўскай і Віленскай губерняў. У прынятай на з’ездзе рэзалюцыі вылучаліся патрабаванні шырокай аўтаноміі Беларусі ў складзе Расійскай Федэратыўнай Дэмакратычнай рэспублікі, навучання ў школах на беларускай мове, паступовага пераходу на беларускую мову ў богаслужэнні [9, с. 87].

На першым этапе сваёй дзейнасці (1917–1918 гг.) сябрамі Злучнасці былі амаль выключна католікі. Што ж датычыцца палітычных поглядаў ХДЗБ, то яна, як і пераважная большасць тагачасных беларускіх нацыянальных партый, аб незалежнасці яшчэ не згадвала, а толькі выказвала ідэю аўтаномнай Беларусі ў складзе Расійскай Федэратыўнай Дэмакратычнай рэспублікі. Пры гэтым першасная ўвага надавалася культурна-асветніцкай працы сярод каталіцкага насельніцтва Беларусі.

24 жніўня 1919 г. выйшаў першы нумар “Беларускай крыніцы” ў Вільні. З гэтага часу менавіта Вільня стала цэнтрам дзейнасці беларускіх хадэкаў.

У рэдакцыйным артыкуле за аўтарствам А. Станкевіча “Браты беларусы” так вызначаліся асноўныя мэты ХДЗБ у дачыненні да беларускага народа:

“1. … Бараніць святую каталіцкую веру, дапамагаць вам яе ўцяміць, развіваць у вас жыццё сапраўднае, бо жыццё духоўнае…

2. … Дамагацца справядлівасці ў жыцці эканамічна-грамадскім…

---

*“Беларуская крыніца” выдавалася з 8(21). 10. 1917 г. у Петраградзе на беларускай мове, з 24. 08. 1919 г. да 12. 07. 1940 г. – у Вільні. З 15. 04. 1937 г. да 16. 11. 1939 г. не выходзіла. Да 1925 г. і з 17. 11. 1939 г. называлася “Крыніца”. Друкавалася то лацінкай, то кірыліцай. У 1934–1939 гг. друкавалася двумя шрыфтамі адначасова.

3. … каб беларусы ў сваёй Бацькаўшчыне пачуліся поўнымі гаспадарамі і вольнымі, годнымі чалавека, грамадзянамі…” [1, с. 1]

14–16 лютага 1918 г. у Петраградзе прайшоў З’езд беларускіх хрысціянскіх дэмакратаў. У верасні гэтага ж года ў Мінску зноў адбыўся сход беларускіх хадэкаў. Менавіта на гэтых двух форумах і былі абмеркаваны і прыняты асноўныя палажэнні Статута і Праграмы ХДЗБ. Асобнай брашурай Статут і Праграма партыі былі выдадзены ў 1920 г. у Мінску [3].

Статут, па-першае, вызначыў назву партыі – “Хрысціянская Дэмакратычная Злучнасць беларусаў”, па-другое, абвясціў асноўную мэту ХДЗБ –“зарганізаванне ўсіх тых, хто хоча жыць, апіраючыся на сацыяльную справядлівасць і хрысціянскую міласць, паводле асноў хрысціянскага светапогляду” [3, с. 1].

У прэамбуле Праграмы ішла гаворка пра ідэалагічныя і арганізацыйныя вытокі ХДЗБ, падкрэслівалася яе сувязь з агульнаеўрапейскім хрысціянска-дэмакратычным рухам, з хрысціянска-дэмакратычнымі арганізацыямі ў Польшчы і Расіі.

У першым пункце Праграмы ХДЗБ ахарактарызавала сябе як арганізацыю грамадскую, “эвалюцыйную, надпалітычную, міжнародную”, што хоча завесці на свеце “лад на аснове хрысціянскай і дэмакратычнай справядлівасці, роўнасці, міласці і свабоды”.

У гэтым жа раздзеле вызначалася палітычнае крэда хрысціянскіх дэмакратаў – змаганне з капіталізмам, як адной з найважнейшых прычын беднасці і галечы працоўных мас і ўсталяванне такога ладу, “каб кожнаму чалавеку магчыма было сваею працаю здабыць сабе неабходнае і карыстаць з усяго культурнага багацця”. Падкрэслівалася, што хрысціянскія дэмакраты супраць усякіх класавых прывілеяў.

Што тычыцца нацыянальнай праграмы беларускіх хадэкаў, то яна ўключала ў сябе “прызнанне права існавання, развіцця і кіравання сабой хоць бы найменшага народу кожнага…. У адносінах да малых народаў, як Літва, Латвія, Беларусь, Украіна, трэба стаяць на грунце поўнага іх самаазначэння”.

ХДЗБ, як партыя клерыкальная, прызнала рэлігію за “найважнейшую падставу існавання людскога, без каторай няпоўным і неспакойным было б жыццё як аднаго чалавека, так і ўсіх народаў”. Пры гэтым для Беларусі вылучалася асобнае патрабаванне: “зблізіць усіх каталікоў і праваслаўных і аб’яднаць іх ў адной веры з рознымі абрадамі.

Значнае месца ў Праграме адводзілася пытанням развіцця сям'і і школы. Мэтай абвяшчалася "ўмацаванне сям'і хрысціянскай". Для хадэкаў прадстаўлялася бясспрэчнай цесная сувязь паміж сям'ёй і школай. Адсюль ставілася задача "ўвясці навучанне пачатковае ў роднай мове; увясці навуку рэлігіі каталіцкай ва ўсе школы ўрадавыя і прыватныя ў роднай мове моладзі…"

Эканамічная праграма Злучнасці не выходзіла за рамкі еўрапейскага лібералізму. ХДЗБ прызнала прыватную ўласнасць "падставай цывілізацыйнага поступу грамадзянства." Таму хрысціянскія дэмакраты былі прынцыпова супраць адмены прыватнай уласнасці. У той жа час яны не адмаўлялі магчымасці паступовага развіцця калектыўных форм уласнасці.

У справе зямельнай патрабаванні Злучнасці зводзіліся да наступнага:

"1. Каб была падзелена казённая зямля паміж беззямельнымі і малазямельнымі з мэтай стварэння малой уласнасці;

2. Агранічыць вялікую ўласнасць прыватную, аблажыўшы яе вялікімі падаткамі;

3. Падняць культуру зямельную дапамогамі ўраду…" [3, с. 9 –13]

Што тычыцца сродкаў вырашэння эканамічных пытанняў на Беларусі, то адзіным магчымым прызнаваўся шлях паслядоўных рэформ.

У галіне нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва беларускія дэмакраты дамагаліся роўнасці ўсіх народаў, свабоднага развіцця нацыянальных моў, роўнасці ўсіх грамадзян перад законам, усеагульнага выбарчага права, развіцця мясцовага самакіравання.

"Кожны народ мае права свабодна развіваць форму жыцця свайго народнага і патрыятычнага. Х.Д. мае перакананне, што не народ для гаспадарства, але гаспадарства патрэбна для пажытку і бяспечнага жыцця народу. Што датычыцца Беларусі, то ХДЗБ жадае, каб яна была цэлай, непадзельнай і вольнай.

Каб на Беларусі была роўнасць і свабода грамадзянская і запэўнены правы народных меншасцяў.

Каб сойм вольнай Беларусі, каторы будзе выдаваць правы, быў выбраны на аснове справядлівага, паўсюднага галасавання і каб толькі ён меў права сказаць слова аб урадзе і яго форме на Беларусі і аб адносінах да другіх гаспадарств …" [3, с. 15].

Як бачым, у сваёй першай праграме беларускія хрысціянскія дэмакраты пакуль яшчэ не вылучалі патрабаванне незалежнасці Беларусі і не ўдакладнялі форму нацыянальна-дзяржаўнага ўладкавання края.

Прадстаўнікі БХД актыўна працавалі ў складзе Беларускага нацыянальнага камітэту (БНК) – каардынацыйнага прадстаўнічага органа беларускіх нацыянальна-дэмакратычных партый і арганізацый, створанага ў Вільні ў 1921 г. БНК ставіў сабе мэтай стварыць Беларуска-Літоўскую дэмакратычную рэспубліку, у першую чаргу дамагаючыся культурна-нацыянальнай аўтаноміі Заходняй Беларусі, вёў культурна-асветніцкую і кааператыўную работу.

Беларускія хрысціянскія дэмакраты прымалі ўдзел у фарміраванні Беларускага цэнтральнага выбарчага камітэта (БЦВК) – каардынацыйнага органа беларускіх палітычных арганізацый у Заходняй Беларусі, створанага ў канцы жніўня 1922 г. У склад камітэту ўваходзілі 12 сяброў БХД.

Асноўнымі задачамі БЦВК былі выпрацоўка агульнай для ўсіх беларускіх партый выбарчай платформы, падбор і падтрымка кандыдатаў у паслы ў Сейм і Сенат Польскай Рэспублікі. Камітэт ішоў на выбары з патрабаваннем свабоды грамадскіх арганізацый, партый, друку, веравызнання. Ён патрабаваў утварэння ў Заходняй Беларусі “аўтаномнай адзінкі з краёвым цэнтрам у Вільні”, валаснога і павятовага самакіравання, арганізацыі войска па тэрытарыяльнаму прынцыпу і інш. [8, с. 458].

Пашырэнне ўплыву БСРГ на заходнебеларускае грамадства, распаўсюджванне марксісцкіх ідэй, узмацненне сацыяльнага радыкалізму ў грамадска-палітычным руху прымусілі беларускіх хрысціянскіх дэмакратаў перагледзець сваю стратэгію і тактыку. Калі ў першыя гады свайго існавання ХДЗБ праводзіла працу выключна ў каталіцкім духу і, перш за ўсё, сярод беларускага каталіцкага насельніцтва, то пазней усё больш увагі надавалася папулярызацыі ідэй хрысціянскага дэмакратызму сярод праваслаўнага сялянства Заходняй Беларусі.

Ідэалагічныя пошукі ХДЗБ знаходзілі адлюстраванне на старонках яе друкаванага органа – газеты “Беларуская крыніца”. У 25 і 26 нумарах “Беларускай крыніцы” за 1926 г. былі надрукаваны праекты адноўленай Праграмы ХДЗБ і яе Статута.

6 лістапада 1927 г. адбыўся з’езд прадстаўнікоў Беларускай Хрысціянскай Дэмакратыі, у якім удзельнічалі 129 сяброў БХД і каля 50 гасцей. Старшынёй з’езда быў аднагалосна абраны А. Станкевіч, які выступіў з дакладам на тэму “БХД і яе ідэалогія” [4, с. 1]. На з’ездзе разгарнулася дыскусія аб Праграме і Статуце партыі. Перш за ўсё, была зменена назва партыі – замест назвы “Хрысціянская Дэмакратычная Злучнасць беларусаў” зацвердзілі назву “Беларуская Хрысціянская Дэмакратыя”. Першы параграф Праграмы ўдакладніў асноўную палітычную мэту партыі:“самастойнасць беларускага народу на ўсіх яго землях, аб’яднаных у незалежную дэмакратычную рэспубліку” [2, с. 184].

Адзначым тут два істотных адрозненні ад Праграмы партыі 1920 г.: адыход ад прынцыпу “надпалітычнасці” і прызнанне незалежнасці Беларусі як галоўнай мэты.

Па меркаванню А. Станкевіча, палітычны незалежніцкі ідэал БХД быў простай і лагічнай высновай з акту 25 сакавіка 1918 г. У той жа час партыя беларускіх хрысціянскіх дэмакратаў трымалася ідэі незалежнай беларускай рэспублікі ў яе этнаграфічных межах толькі ў самых агульных абрысах. Унутраны сацыяльны лад рэспублікі, яе узаемаадносіны з суседзямі і іншыя практычныя пытанні пакідаліся на вырашэнне ў перспектыве, “у адпаведнасці з духам часу і зыходзячы з патрэб беларускага народа” [2, с. 230].

З’езд прыняў таксама шэраг рэзалюцый па пытаннях, якія тычыліся рэлігійнага жыцця, асветы, выбараў у дзяржаўныя органы ўлады [4].

Чарговы з’езд БХД адбыўся ў Вільні 25 лістапада 1928 г. У ім прынялі ўдзел 72 сябры БХД і 31 госць [2, с. 181]. На гэтым з’ездзе выступіў пасол А.Стэповіч з аглядам Праграмы і Статуту партыі. Былі ўнесены пэўныя змены не істотнага зместу.

Апошні з’езд БХД прайшоў 13 снежня 1931 г., таксама ў Вільні. Па звестках А. Станкевіча, у рабоце з’езда прынялі ўдзел 101 сябар БХД (як каталіцкага, так і праваслаўнага веравызнання) і 24 госці. З’езд абмеркаваў Праграму і Статут партыі і ўнёс пэўныя карэктывы [2, с. 182].

Надрукаваная ў 1932 г., 4-я праграма БХД, у адрозненне ад папярэдніх, не дапускала магчымасці аддзялення касцёла (царквы) ад дзяржавы. У ёй падкрэслівалася, што “БХД прынцыпова супраць аддзялення касцёла (царквы) ад дзяржавы і змагаецца з палітыкай,

што выкарыстоўвае рэлігію для палітычных мэтаў, або падтрымлівае адну рэлігію супраць другой".

У Праграме БХД 1932 г. больш увагі надавалася сацыяльна-эканамічным пытанням. Так, 34 параграф Праграмы быў дапоўнены палажэннем аб тым, што "ўсе землі, перавышаючыя працоўную норму, перадаюцца ва ўласнасць і без выкупу беззямельным і малазямельным сялянам".

23 кастрычніка 1935 г. ЦК БХД апублікаваў "Камунікат". Адмаўляючыся ад удзелу ў антыфашысцкім народным фронце, кіраўніцтва БХД заяўляла, што толькі Беларуская хрысціянская дэмакратыя "з'яўляецца адзінай у межах Польшчы моцнай ідэйна і арганізацыйна сцэментаванай беларускай палітычнай арганізацыяй". У Камунікаце ўказвалася на неабходнасць "кансалідацыі беларускіх нацыянальных сіл і працы на карысць Бацькаўшчыны" [6, с. 52].

У 1936 г. БХД прыняла апошнюю, 5-ю Праграму. Перш за ўсё, была зацверджана новая назва партыі "Беларускае народнае аб'яднанне" (БНА). Змена назвы партыі не мяняла яе сутнасці, а павінна была падкрэсліць незалежнасць ад касцёла. Новай назвай беларускія хрысціянскія дэмакраты паказалі таксама свае яўныя прэтэнзіі на прадстаўніцтва інтарэсаў усяго беларускага насельніцтва.

У якасці галоўнай грамадска–палітычнай мэты ў Праграме абвяшчалася імкненне БНА да таго, "каб у незалежнай Беларусі быў створаны такі грамадскі лад, які, абапіраючыся на працу, грамадскую роўнасць і справядлівасць, не дапускаючы да эксплуатацыі адных другімі, забяспечваў бы палітычна-грамадскія, культурныя і эканамічныя патрэбы грамадзян. БНА супраць дыктатуры капіталізму, фашызму і камунізму" [7, с. 82].

Нацыянальная праграма беларускіх хадэкаў засноўвалася на патрабаванні "самастойнасці беларускага народа ва ўсіх яго этнаграфічных землях, аб'яднаных у незалежную дзяржаву" [7, с. 82].

З рэарганізацыяй БХД у БНА не пагадзілася нацыяналістычна настроеная кансерватыўная група хадэкаў на чале з В. Гадлеўскім. Яны стварылі новую партыю – Беларускі нацыянальны фронт (БНФ). Друкаваным органам гэтай партыі была газета "Беларускі фронт", што выходзіла з мая 1936 па 1939 гг. у Вільні.

Палітычная праграма БНФ абвяшчала галоўнай мэтай самастойнасць і незалежнасць Беларусі ў адпаведнасці з Статутнай граматай БНР ад 25 сакавіка 1918 г. Пры гэтым БНФ адкрыта выступіла супраць "так званага парламенцкага дэмакратызму", супраць роўнасці ўсіх грамадзян Беларусі.

Згодна з Праграмай БНФ, толькі прадстаўнікі беларускай нацыі мелі права вызначаць палітычны і грамадскі лад Беларускай рэспублікі. "Іншыя нацыянальнасці, як яўрэі, палякі, расейцы…ня могуць прымаць удзел у палітычным і грамадскім будаўніцтве Беларусі". Больш таго, у раздзеле XIII "Асадніцтва" было прапісана, што "ўсе чужыя Беларускай Нацыі элементы, як яўрэі, цыганы, польскія, расійскія і ўсякія іншыя асаднікі і каланісты прымушаны будуць на працягу азначанага законам часу з Беларусі выехаць".

Лідэры БНФ выступілі за моцную дзяржаўную ўладу, дапускаючы нават устанаўленне дыктатуры. "Аўтарытарнасць, злучаная з законнасцю, павінна быць падставай урадавання кожнае беларускае дзяржаўнае ўстановы". "Найбольшым ворагам" беларускага народу абвяшчаўся Савецкі Саюз. "Дзеля гэтага кожны вораг расейскага камунізму ёсць наш прыяцель" [5].

Лідэры БНФ лічылі, што вайна, якая набліжалася ў Еўропе, магла мець вынікам кардынальную змену суадносін сіл на кантыненце і заклікалі беларусаў быць гатовымі выкарыстаць магчымы гістарычны шанс для рэалізацыі незалежніцкага ідэалу.

Такім чынам, палітычная праграма так званага Беларускага нацыянальнага фронту фактычна адкінула ўсе папярэднія дасягненні БХД у накірунку замацавання прынцыпаў дэмакратызму, хрысціянскай маралі, роўнасці грамадзян, незалежна ад веравызнання і нацыянальнасці ў беларускім грамадстве. Ва ўмовах усталявання фашысцкіх рэжымаў у шэрагу еўрапейскіх краін сябры БНФ адкрыта прапагандавалі нацыяналістычныя настроі, а ў час Вялікай Айчыннай вайны ўвайшлі ў склад калабаранцкіх арганізацый.

Ідэйна-палітычнае афармленне БНФ фактычна азначала крызіс Беларускай хрысціянскай дэмакратыі, якая так і не здолела ператварыцца ў масавую палітычную партыю. Беларускія хрысціянскія дэмакраты выступалі за эвалюцыйны шлях развіцця грамадства, легальныя формы барацьбы, адмоўна ставіліся да сацыялістычнай рэвалюцыі. Як прыхільнікі незалежніцкіх ідэалаў,

беларускія хадэкі прытрымліваліся тэорыі самабытнасці развіцця беларускай нацыі і абуджалі нацыянальную свядомасць беларусаў на аснове хрысціянскай этыкі і дэмакратычных прынцыпаў. Сябры ХДЗБ-БХД-БНА выступалі супраць сацыяльна-класавага падыходу ў дзейнасці Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі, рэвалюцыйнага характару Беларускай сялянска-работніцкай грамады, згодніцтва паланафільскіх груповак. Яны асуджалі тэрор і ганенні заходнебеларускага насельніцтва з боку польскіх уладаў, з самага пачатку сваёй дзейнасці былі прыхільнікамі беларусізацыі касцёла (царквы).

У праграмных дакументах ХДЗБ-БХД-БНА шмат было супярэчлівага, ідэалістычнага для ўмоў тагачаснай Беларусі. Па сутнасці, Беларуская хрысціянская дэмакратыя не здолела знайсці шырокую падтрымку сярод працоўнага насельніцтва Заходняй Беларусі, асабліва праваслаўнага веравызнання, не стала масавай палітычнай партыяй.

Выкарыстаная літаратура


1. Stankievic, Ad. Braty Bielarusy / Ad. Stankievic // Krynica. – 24 жніўня 1919. – N.1. – S. 1.

2. Stankievic, Ad. Bielaruski Chryscianski ruch (Histarucny narys). / Ad. Stankievic. – Vilnia: Vydannie “Chryscianskaj Dumki”, 1939. – 272 s.

3. Ustawa i pragrama Chryscijanskaj Demakratycznaj Zlucznasci Bielarusau. – Miensk: Drukarnia Wajskowaja, 1920. – 17 s.

4. Беларуская крыніца. – 18 лістапада 1927. – № 47. – С. 1.

5. Ідэолёгічны Статут Беларускага Нацыянальнага Фронту // Ёрш Сяргей. Рыцар Свабоды. (Ксёндз Вінцэнт Гадлеўскі як ідэолаг і арганізатар беларускага антынацысцкага Супраціву). – Менск: Беларускі Рэзыстанс, 2004. – С. 37-49.

6. Ладысеў, Уладзімір. Насуперак волі народа: З гісторыі палітычнага банкруцтва беларускіх нацыяналістычных партый і арганізацый у Заходняй Беларусі (1934-1939 гг.). / У. Ладысеў. – Мн.: Бібліятэчка газеты “Голас Радзімы”, 1976. – 76 с.

7. Праект Праграмы Беларускага народнага аб’яднання // Палітычныя партыі Беларусі. – Мн.: “Згода”, 1994. – 261 с.

8. Сідарэвіч, А.М. Беларускі цэнтральны выбарчы камітэт / А.М. Сідарэвіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. У 6 т. Т.1. – Мн.: БелЭн, 1993. – С. 458.

9. Станкевіч, А. Да гісторыі беларускага палітычнага вызвалення / А. Станкевіч. – Вільня: Шлях моладзі, 1935 – 128 с.

## СТВАРЭННЕ І ДЗЕЙНАСЦЬ ІНСТЫТУЦЫЙНЫХ ОРГАНАЎ САЦЫЯЛЬНАГА ПАРТНЁРСТВА Ў РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ Ў 1990-я гг.

А.А. Дубовік, ст. выкладчык

З абвяшчэннем у верасні 1991 г. незалежнасці Рэспублікі Беларусь і пачаткам пераходу да рыначнай эканомікі наступіў новы перыяд у сацыяльна-працоўных адносінах. Пачала складвацца сістэма ўзаемаадносін органаў дзяржаўнага кіравання з прафсаюзамі і аб’яднаннямі прадпрымальнікаў, заснаваная на прынцыпах сацыяльнага партнёрства. 15 снежня 1992 г. Законам Рэспублікі Беларусь «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у КЗаП Рэспублікі Беларусь» у беларускае заканадаўства быў уведзены тэрмін «сацыяльнае партнёрства». У арт. 1 Закона адной з задач заканадаўства аб працы называлася «развіццё сацыяльнага партнёрства паміж работнікамі і наймальнікамі» [1].

Раней, у прынятай 10 кастрычніка 1991 г. пастанове Савета Міністраў «Аб укараненні ў практыку работы заключэння тарыфных эканамічных пагадненняў» было даручана Дзяржаўнаму камітэту па працы, Дзяржэканамплану, Міністэрству юстыцыі з удзелам аб’яднанняў прадпрымальнікаў і Савета Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі (ФПБ) падрыхтаваць і да канца года ўнесці ў Савет Міністраў прапановы па стварэнню ў рэспубліцы сістэмы сацыяльнага партнёрства ў галіне сацыяльна-працоўных адносін [2, арк.75].

Трэба адзначыць, што фарміраванне сацыяльна-партнёрскіх адносін у Беларусі і іншых краінах СНД у 90-х гг. XX ст. адбывалася ва ўмовах вострага крызісу ўсёй сістэмы грамадскіх адносін. Станаўленне рыначнай эканомікі абумовіла змяненне падыходаў да рэгулявання працоўных адносін. На першае месца выходзяць калектыўна-дагаворныя метады рэгулявання. Патрэба ў абароне інтарэсаў працаўнікоў была матывам стварэння сістэмы сацыяльнага партнёрства, якое стала адным з важнейшых кірункаў сацыяльнай палітыкі дзяржавы.

Сістэма сацыяльнага партнёрства, якая фарміравалася ў гэты перыяд, уключала ў сябе заканадаўчую базу як аснову яго